# ВЫКАНАЦЬ ВОЛЮ НАРОДАЎ!

## Выступленне Ц. Я. КІСЯЛЁВА—Старшыні Савета Міністраў Беларускай ССР, кіраўніка дэлегацыі БССР на V надзвычайнай спецыяльнай сесіі Генеральнай Асамблеі ААН 23 чэрвеня 1967 года

Пан старшыня!
Панове дэлегаты!

Раніцай 5 чэрвеня народы арабскіх краін сталі ахвярамі вераломнага ўзброенага нападу. Ізраіль па загадзя распрацаванаму плану пачаў агрэсію супраць суседніх арабскіх краін.

У выніку энергічных дзеянняў сацыялістычных і іншых міралюбівых дзяржаў, а таксама рашэнняў Савета Бяспекі ўдалося дабіцца спынення агню. Аднак на Блізкім Усходзе захоўваецца напружаная абстаноўка. Войскі агрэсара працягваюць акупіраваць захопленыя тэрыторыі Аб'яднанай Арабскай Рэспублікі, Сірыі і Іарданіі, стварылі там абстаноўку самавольства і тэрору. Авантурыстычная палітыка ізраільскай ваеншчыны, якая адмаўляецца пакінуць захопленыя ў суседніх дзяржаў землі, можа ў любы час прывесці да ўзнікнення новага ваеннага канфлікту. Гэта абгрунтавана трывожыць усіх тых, каму дарагая справа міру. І не выпадкова велізарная большасць дзяржаў—членаў ААН хутка адгукнулася на прапанову Савецкага Саюза аб скліканні надзвычайнай спецыяльнай сесіі Генеральнай Асамблеі ААН, перад якой стаіць задача асудзіць ізраільскага агрэсара, дабіцца вываду войск, ліквідацыі вынікаў агрэсіі і патрабаваць пакрыцця страт, нанесеных арабскім народам.

У ходзе прайшоўшых ужо стаўнікі ЗША і Англіі выступяць супраць агрэсіі. Крумкач крумкачу вока не выдзяўбе.

У гісторыі міжнародных адносін яшчэ не зафіксаваны выпадак, каб патуральнік агрэсіі асудзіў агрэсара. Ізраіль са свайго боку не асуджае агрэсію ЗША супраць в'етнамскага народа, не патрабуе яе спынення. Не бачылі мы Ізраіль і сярод тых краін, якія абаранялі правы народаў Конга, Дамініканскай Рэспублікі або выступалі за свабоду і незалежнасць усё яшчэ пакутуючых у каланіяльным рабстве народаў. У сваю чаргу, імперыялістычныя сілы аказваюць дапамогу Ізраілю, выкарыстоўваюць яго для правядзення сваёй неакаланіялісцкай палітыкі на Блізкім Усходзе і ўмацавання сваіх пазіцый у некаторых афрыканскіх краінах.

За кароткую гісторыю свайго існавання Ізраіль неаднаразова рабіў узброеныя напады на суседнія арабскія краіны. Ізраільскі ўрад, пад маркай клопатаў аб існаванні сваёй дзяржавы, ператварыў яе ў пастаяннага парушальніка міру і спакою на Блізкім Усходзе. Здавалася б, што Ізраіль, як дзяржава, створаная Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый, павінен рашэнняў Генеральнай Асамблеі ААН аб неўмяшанні адных дзяржаў ва ўнутраныя справы іншых краін і народаў, за выкананне нашых сумесных рашэнняў аб дэкаланізацыі. Неабходна настойліва дабівацца пагадненняў аб нераспаўсюджанні і забароне ядзернай зброі, аб усеагульным і поўным раззбраенні.

У адпаведнасці са Статутам ААН галоўная адказнасць за захаванне і падтрыманне міру ляжыць на вялікіх дзяржавах. Але нават самая маленькая дзяржава можа ўнесці істотны ўклад у выкананне тых прынцыпаў і мэт, якія абвешчаны ў Статуце ААН: пазбавіць будучыя пакаленні ад бедстваў вайны, якая двойчы ў нашым жыцці прынесла чалавецтву невыказнае гора; праяўляць цярпімасць і жыць разам, у міры адзін з адным, як добрыя суседзі; аб'яднаць нашы сілы для падтрымання міжнароднага міру і бяспекі; вырашаць свае міжнародныя спрэчкі мірнымі сродкамі.

Аднак імперыялістычныя колы пэўных дзяржаў адкрыта парушаюць прынцыпы Статута ААН, спрабуюць затрымаць нацыянальнае развіццё народаў па шляху прагрэсу. Мы назіратоўнага вераломнага нападу, ізраільскія войскі захапілі тэрыторыю, на якой жыве паўтара мільёна арабаў і якая амаль у чатыры разы перавышае плошчу ізраільскай дзяржавы. У Тэль-Авіве цяпер ужо не клапоцяцца аб тым, каб утойваць свае намеры. Калі ў першыя дні агрэсіі ізраільскія кіраўнікі, імкнучыся ашукаць сусветную грамадскую думку, гаварылі аб адсутнасці ў іх тэрытарыяльных дамаганняў, то цяпер пра гэтыя сцвярджэнні яны забылі. Так, міністр абароны Ізраіля заявіў, што яго краіна ніколі не пойдзе з Газы і заходняга берага ракі Іардан. У Тэль-Авіве ідуць толькі спрэчкі, ці трэба далучаць да Ізраіля ўсе захопленыя землі або толькі частку іх.

Ізраільскі ўрад спешна стварыў міністэрскі камітэт для ўрэгулявання пытанняў, звязаных з кіраваннем раёнамі ААР, Іарданіі і Сірыі, захопленымі ізраільскай арміяй. Гэты факт проста гаворыць аб нежаданні ізраільскіх улад пакінуць гэтыя раёны, аб іх імкненні гаспадарыць там паводле свайго меркавання.

У друку падрабязна паведамлялася аб планах Ізраіля па эксплуатацыі нафтавых месцавасць, калі працягваюцца акупацыя і бясчынствы з боку Ізраіля, няма нічога разумнага ў такім «урэгуляванні», якое заснавана на парушэнні міжнароднага права, Статута і прынцыпаў, на якіх грунтуецца ААН.

Праект рэзалюцыі, унесены дэлегацыяй ЗША, сведчыць аб імкненні павесці Генеральную Асамблею ў бок ад галоўнай і першараднай мэты, што стаіць перад ёй. Гэты праект замест асуджэння агрэсіі Ізраіля і патрабавання ліквідацыі яе вынікаў, па сутнасці справы заахвочвае агрэсара дыктаваць свае ўмовы з пазіцыі сілы.

Такі падыход да вырашэння разглядаемага намі пытання не выпадкова выклікаў справядлівае абурэнне многіх дэлегацый, што ўдзельнічаюць у рабоце сесіі. На самай справе, абмеркаванне пытання аб агрэсіі Ізраіля супраць арабскіх краін яшчэ ў Савеце Бяспекі паказала, што спробы амерыканскай дэлегацыі звязаць пытанне аб вывадзе войск Ізраіля з захопленых ім тэрыторый з нейкімі іншымі ўмовамі, з так званым агульным урэгуляваннем і да т. п. з'яўляліся зусім відавочным манеўрам, які павінен быў дапамагчы агрэсару замацавацца на акупіраваных ім тэрыторыях, дабіцца пераваг. І гэта пацверджана і тым, што ЗША ў Савеце Бяспекі і на гэтай сесіі адмаўляюцца падтрымаць прапанову аб безагаворачным вывадзе войск агрэсара за лініі перамір'я.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы